Семечка Г.М., студ. гр. 313 ФТБК і СМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Катлярская Л.Я.,
выкладчык

# ДЫВАНЫ МАЗЫРШЧЫНЫ: АСАБЛІВАСЦІ КОЛЕРУ

Дыван – мастацкі тэкстыльны выраб, звычайна з шматколерным узорам, прызначаны пераважна для ўпрыгожвання і ўцяплення жылля. Бываюць ворсавыя і бязворсавыя (кілімы, паласы, шпалеры, габелены), маляваныя ці набіваныя на тканіне, радзей паперы або цыраце. Вырабляюцца ручным спосабам з сярэдзіны XIX ст. Мастацкія асаблівасці вызначаюцца фактурай тканіны, характарам матэрыялу і фарбавальнікаў, фарматам, суадносінамі бардзюра і цэнра поля дываноў, характарам і кампазіцыяй арнаменту, колеравым строем. На Беларусі вядомы так званыя дворскія бязворсавыя дываны, блізкія па кампазіцыі да народных, або з пераймannem заходнееўрапейскай стылістыкі і матываў дэкору, якія ткалі ў гарадах, мястэчках, магнацкіх майстэрнях.

У XVIII ст. у многіх гарадах (Гродна, Слонім, Карэлічы, Нясвіж, Мір) узнікаюць мануфактурныя прадпрыемствы прамысловага тыпу, на якіх ткалі дываны і шпалеры сюжэтна-тэматычнага і арнаментальна-дэкаратыўнага характару для аздаблення інтэр’ераў замкаў, палацаў, сядзіб. Створаныя паводле канонаў вядомых заходнееўрапейскіх мастакоў мясцовымі майстрамі, вырабы вызначаюцца высокімі тэхналагічнымі, дэкаратыўнымі і мастацкімі якасцямі.

У народным побыце дываны набываюць пашырэнне з канца XIX ст., у сувязі з паляпшэннем інтэр’ера традыцыйнага жылля, пашырэннем новых ткацкіх тэхнік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звычайна ў народным побыце ролю дываноў выконвалі посцілкі павышанай дэкаратыўнасці, якія мацавалі на сцяне над ложкам. Яны мелі пераважна цэнтрычную кампазіцыю з багата распрацаваных геаметрычных, раслінных, зааморфных матываў і дробнаўзорыстую акаймоўку па краях.

У першай палове XX ст. папулярнасць набылі маляваныя дываны (на тканіне, радзей паперы, цыраце), створаныя на аснове багатых традыцый узорыстатканых дываноў і посцілак. Пераважна гэта былі маляваныя на чорным фоне кампазіцыі з букетам кветак у цэнтры, акаймаваным гірляндай з раслінных парасткаў, кветак, бутонаў, лісця. Часам маляваныя дываны мелі сюжэтна-тэматычны характар наіўна-рэалістычнага кірунку (творы А.Кіш, Я.Драздовіча і інш.) [2, 130 -131]

Асаблівай выразнасцю і гарманічнасцю каларыстыкі вызначаюцца маляваныя дываны Мазыршчыны. Выконваліся яны пэндзлем, клеевымі ці алейнымі фарбамі на саматканым ільняным палатне без папярэдняга эскіза. На палатно спачатку наносілі грунт і фарбавалі часцей за ўсё ў чорны колер. Ёсць выпадкі, калі тэхніка роспісу дапаўнялася ўжываннем набіванак і трафарэтаў.

Калі разглядаць менавіта мазырскія маляваныя дываны, то можна адзначыць, што для іх больш характэрна замкнёная гарызантальная сіметрычная кампазіцыя з выразным і даволі буйным цэнтрам. Паводле кампазіцыйна-дэкаратыўнага вырашэння яны былі у асноўным раслінна-арнаментальныя. Асноўны матыў мазырскіх дываноў – гэта букет кветак, ці ваза з садавінай. Вакол цэнтральнага элемента звычайна размяшчаюцца гірлянды пераплеценых галінак, кветак, лісця. Часам ў раслінны ўзор уводзіцца геаметрычны арнамент – гэта кругі, ромбы, зоркі.

Адметнай рысай дываноў мазырскага раёна з’яўляецца тое, што ў аснове стылізацыі элементаў кампазіцыі ляжаць рытмічна арганізаваныя мазкі. Менавіта такая пластыка больш не сустракаецца ні ў адным рэгіёне Беларусі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Каларыт маляваных дываноў Мазыршчыны таксама адметны. Ён адрозніваецца лакальнасцю колераў і кантрастам каляровых спалучэнняў. У асноўным, у каляровым аздабленні дываноў выкарыстоўваліся галоўныя, чыстыя колеры: чырвоны, белы, зялёны, блакітны (ці сіні) і жоўты (ці карычневы). Каляровыя спалучэнні гарманічныя і ўраўнаважаныя, паміж колерамі існуе ўзаемасувязь і адзінства. [3, 215]

Яркім прыкладам маляваных дываноў мазырскага раёна з'яўляецца твор невядомага аўтара "Букет з макамі і рамонкамі". У ім ствараецца уяўленне кампазіцыйнай і каларыстычнай цэласнасці. Тут выкарыстаны чырвоны, зялёны, белы, сіні і жоўты колеры, якія нанесены на палатно чорнага колеру. Чорны фон аказвае на храматычныя, высоканасычаныя чырвоныя і зялёныя колеры, вельмі моцнае ўздзеянне: яны святлеюць, іх насычанасць павялічваецца і яны нібы свецяцца. [3, 217] Асабліва выразна гэта падкрэслівае і белы колер, які выкарыстаны ў дыване ў невялікай колькасці, але ён надае тым самым усяму расліннаму матыву ажурнасць і вытанчанасць.

Элементы структуры кампазіцыі будуюцца на чыста дэкаратыўных элементах (у цэнтры дывана – букет кветак, заключаны ў форму круга, вакол яго сіметрычна размяшчаюцца фрагменты з такімі ж расліннымі формамі, як і ў цэнтры – гэта макі, лісце і дробныя дэкаратыўныя элементы, а край па перыметру арнаментуецца рознакаляровымі расліннымі элементамі).

Раўнавага каляровых таноў дасягаецца тут прыкладна роўнай колькасцю галоўных колераў – чырвонага і зялёнага, і роўнай насычанасцю чырвонага, зялёнага, жоўтага і сіняга.

Чырвоны і зялёны колеры дамінуюць у каларыце дывана "Букет з макамі і рамонкамі". Абодва колеры ў роўнай ступені насычаныя, чыстыя і аднолькавыя па светлаце. У большасці элементаў усё лісце вырашана аднолькавым стылістычным прыёмам і чыстым колерам. У кветках ужо з'яўляюцца разбелы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зацямненні. І, хоць гэтыя элементы і звязаныя з прыроднымі ўяўленнямі, гэта – стылістычна-дэкаратыўны прыём.

Жоўтага колеру няшмат, ён выкарыстаны ў невялікай колькасці і выглядае як дробны элемент.

Меньш за ўсё ў дыване выкарыстаны сіні колер. Цэнтральны элемент кампазіцыі аздоблены дробнымі сінімі кветкамі. Колер насычаны, але нясветлы, таму дробныя кветкі нібы раствараюцца на чорным фоне. Звычайна, у мазырскіх маляваных дыванах сіняму колеру не аддаецца перавага, яго колькасць не спрачаецца з іншымі.

У цэлым, у дыване "Букет з макамі і рамонкамі", як і ў большасці мазырскіх маляваных дываноў, праследжваецца тэндэнцыя выдзялення галоўнага цэнтральнага элементу. Гэта дасягаецца пры дапамозе моцнага кантрасту цэнтра з чорным фонам. Чорны колер у найбольшай колькасці сканцэнтраваны менавіта паміж цэнтральным элементам і астатнімі фрагментамі кампазіцыі. А рознакаляровае абрамленне наадварот, на фоне кампазіцыйнага цэнтра выглядае недакучліва і падкрэслівае завершанасць і цэласнасць усёй кампазіцыі.

Увогуле, мазырскія маляваныя дываны можна вылучыць сярод астатніх як адзін з найбольш непаўторных і адметных відаў беларускіх маляваных дываноў.

Нажаль, сёння амаль не засталося тых, хто стварае гэтыя мастацкія творы, але іх мастацтва і па сённяшні дзень жыве ў народнай культуры і побыце.

Спіс літаратуры:

1. "Беларускія маляваныя дываны" – альбом-каталог з фондаў гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе", Мн.,2005.

2. "Народная культура Беларусі" – энцыклапедычны даведнік пад рэд. В.С.Цітова, Мн.,2002.

3. Пармон Ф.М. "Композиция костюма": учебник для вузов. – М.:Лехпромбытиздат, 1997 – 318с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ